# САМАПРЭЗЕНТАЦЫЯ КНІГАПІСЦАЎ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА, НОЎГАРАДА І ВЯЛІКАГА КНЯСТВА МАСКОЎСКАГА Ў XIII – ПАЧАТКУ XVI СТАГОДДЗЯЎ: ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПЫТАННЯ

**А. А. Паршанкоў**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*Alex.par5@yandex.by;*
*навук. кір. – А. І. Груша, д-р гіст. навук, дац.*

У артыкуле разглядаецца стан даследаванасці праблемы самапрэзентацыі старажытных кнігапісцаў. Робяцца высновы аб перспектывах далейшага вывучэння тэмы. Аўтар прыходзіць да высновы, што пытанне самапрэзентацыі ў дачыненні да старажытнарускай літаратуры разглядалася ў гістарыяграфіі. Аднак даследчыкі не выкарысталі ўвесь той патэнцыял па гэтым пытанні, які змяшчаюць у сабе разнастайныя крыніцы, таму праблему нельга лічыць вырашанай.

Галоўная мэта артыкула – прапанаваць задачы, якія патрабуюць рашэння для навуковага асэнсавання ўзнятай аўтарам праблемы – самапрэзентацыі кнігапісцаў Вялікага Княства Літоўскага, Ноўгарада і Вялікага Княства Маскоўскага ў XIII – пачатку XVI стагоддзяў.

***Ключавыя словы***: самапрэзентацыя; аўтарская свядомасць; кнігапісцы; калафоны; Вялікае Княства Літоўскае.

Самапрэзентацыя – гэта працэс, з дапамогай якога асобныя індывіды прадстаўляюць сябе ў сацыяльным свеце. Паспрабуем высвятліць, у якой ступені ў гістарыяграфіі знайшлі адлюстраванне праблемы аўтарскай самапрэзентацыі кнігапісцаў Вялікага Княства Літоўскага, Ноўгарада і Вялікага Княства Маскоўскага.

Кнігапісцы эпохі Старажытнай Русі патрапілі ў поле зроку гісторыкаў у сярэдзіне пазамінулага стагоддзя [1]. Аднак пытанню аўтарскай самапрэзентацыі даследчыкі XIX ст. амаль не надавалі ўвагі. Палеографаў, філолагаў, гісторыкаў цікавілі больш пытанні сацыяльнага статусу кнігапісца (манах ён, ці святар; свецкая гэта альбо духоўная асоба) і, часам, у якасці выключэння, матывацыя кнігапісцаў.

Іван Някрасаў у артыкуле «Старажытнарускі літаратар» (1867 г.) закрануў пытанне матывацыі выключна стваральнікаў жыційнай літаратуры [2]. Някрасаў выдзеліў наступныя прычыны, што пабуджалі да напісання жыцій: патрабаванне з боку калектыва манастыра (часам распараджэнне ігумена), апасенне памерці з-за непаслушэнства, захворванне кнігапісца (хворы даваў абет святому спісаць яму жыціе), неабходнасць захаваць памяць пра святых [2, с. 43–44].

У 1897 г. выйшаў артыкул Мікалая Волкава «Ці сапраўды безыменнай была большая частка прац старажытнарускіх

перапісчыкаў» [3]. Прааналізаваўшы запісы пісцоў у даступных яму кнігах аўтар напісаў: «…я не бачу цвёрдых падстаў не прызнаваць нашыя *старажытныя* кнігі іменнымі працамі» [3, с. 82]. Аўтар падкрэсліў, што вывучаючы кнігі старажытнарускага часу (да XIV ст.) мы маем справу з асабістай творчасцю ды, зразумела, з творчай асобай. Артыкул Волкава можна назваць першай спробай акрэсліць пытанне самапрэзентацыі кнігапісцаў.

Даследаваннем дзейнасці і асобы старажытнарускіх кнігапісцаў займаўся Яўхім Карскі. Карскі першым прапанаваў падзяляць кнігапісцаў на духоўных і свецкіх асоб на падставе запісаў пісцоў і складу эпітэтаў. Так, гісторык лічыў, што сціслыя фармуліроўкі, якія абмяжоўваліся толькі ўпамінаннем імя перепісчыка, напрыклад «Путята псалъ», сведчаць пра прыналежнасць перапісчыка да ліку прафесійных рамеснікаў, і наадварот, насычаныя эпітэтамі калафоны ўказваюць на перапісчыка «Бога дзеля» (кнігапісца, які не атрымоўваў за сваю працу грошаў) [4, с. 262].

Карскі, паказаўшы, што традыцыя пасляслоўяў перайшла на Русь ад Візантыі, упершыню падрабязна прааналізаваў структуру старажытнарускіх і Візантыйскіх калафонаў. Даследчык таксама звярнуў увагу і на эпітэты, пры дапамозе якіх перапісчыкі называлі сябе, растлумачыў прычыны перашкод працы, якія ўказваліся самімі кнігапісцамі [4, с. 276–278].

Працу Карскага можна лічыць адной з самых грунтоўных сярод тых, што ў той ці іншай ступені пралівалі святло на праблему дзейнасці і асобы старажытнарускага кнігапісца. Падрабязны ж разгляд запісаў пісцоў зрабіў працу Карскага першай, якая ўшчыльную наблізілася да пытання самапрэзентацыі кнігапісцаў.

Савецкая гістарыяграфія звузіла кола пытанняў, звязаных з вывучэннем асобы старажытнарускага перапісчыка. Вучоныя ў большасці сканцэнтраваліся на высвятленні сацыяльнага статусу пісцоў, таму іх амаль не цікавіў унутраны свет перапісчыкаў.

Так, Барыс Рыбакоў у дзвюх невялікіх главах працы «Рамяство ў Старажытнай Русі» імкнуўся даказаць прыналежнасць большасці пісцоў да катэгорыі свецкіх асоб [5, с. 405–407]. Згодна з меркаваннем Рыбакова пісцы, якія прама не назвалі сваёй прыналежнасці да царквы з’яўляюцца свецкімі «книжными списателями». Гісторыка не цікавілі пытанні, якія выходзілі за межы быта пісцоў [5, с. 684–682].

Мікалай Розаў і Барыс Сапуноў даследавалі працягласць і аплату працы кнігапісцаў, характарыстыку заказчыкаў ды тыя пытанні, што разглядаў Рыбакоў, зрэдку закранаючы ўнутраны свет кнігапісца [6; 7].

Па пытанню самапрэзентацыі кнігапісцаў нейкіх новых дасягненняў у савецкай гістарычнай навуцы не было.

Дастаткова падрабязна апісана дзейнасць старажытнарускіх кнігапісцаў у манаграфіі Любові Сталяровай і Сяргея Каштанава «Кніга ў Старажытнай Русі (XI–XVI стст.)» [8, с. 127–156]. Аўтары звярнуліся да ўдакладнення важных пытанняў, звязаных з дзейнасцю вытворцаў кніг. Каштанаў і Сталярова абверглі тэзіс аб перавазе свецкіх перапісчыкаў у кніжнай вытворчасці Старажытнай Русі [8, с. 139, 145].

Наконт самавызначэння даследчыкі прыйшлі да наступнай высновы: «У выходных і іменных запісах, складзеных па пэўным шаблоне, з досыць строгай і малярухомай структурай, якія змяшчаюць звесткі, што непасрэдна тычацца кнігапісання, ... самавызначэнне пісца ўключае нараўне з імем ўказанне яго сацыяльнага статусу. У малітоўных, дзённікавых і фальклорных запісах, свабодных ад выкладу канкрэтных абставінаў кніжнай вытворчасці, такія звесткі адсутнічаюць» [8, с. 137]. Пытанне самапрэзентацыі кнігапісцаў *спецыяльна* не асвятлялася.

У 2000 г. ўбачыла свет манаграфія Алены Каняўскай «Аўтарская свядомасць старажытнарускага кніжніка XI – сяр. XV ст.» [9]. У гэтай кнізе закранаецца характар так званых «самапрыніжальных» формул у старажытнарускай літаратуры. Каняўская звяртае ўвагу на тое, што звычайна гаворыць аўтар пра сябе. «Што звычайна кажа пра сябе сярэднявечны аўтар?...ён бядуе з-за вышыні задач, якія стаяць перад ім, і немагчымасці выканаць іх з прычыны ўласнай недасканаласці» [9, с. 19]. Даследчыца адзначыла, што адной з галоўных асаблівасцяў свядомасці старажытнарускага кніжніка з’яўляецца накіраванасць на самакрытыку, яго прафесійную недасканаласць. Аднак сярод прапанаваных для разгляду прыкладаў аўтарскай свядомасці не было кнігапісцаў, што не з’яўляліся аўтарамі.

Пры аглядзе айчыннай гістарыяграфіі нельга не адзначыць даследаванні Любові Ляўшун. Ляўшун выказала меркаванне, згодна з якім выкарыстанне самапрыніжальных эпітэтаў абумоўлена не толькі традыцыяй і «этыкетам», а благагавеннем «перад "думкай Боскай", якая не можа быць адэкватна перададзенай у словах грэшным чалавекам» [10, с. 56]. Працягваючы думку А. Каняўскай, даследчыца падкрэсліла, што аўтар-кнігапісец Старажытнай Русі не ўспрымаў сябе як індывідуальнага творца, а выказваўся як «прадстаўнік Царквы і ёмішча Духа» [10, с. 56].

Пытанне самапрэзентацыі ў дачыненні да старажытнарускай літаратуры разглядалася ў гістарыяграфіі. Аднак даследчыкі, якія вывучалі гісторыю літаратуры, не выкарысталі ўвесь той патэнцыял па гэтым пытанні, які змяшчаюць у сабе разнастайныя крыніцы.

Для даследавання самапрэзентацыі кнігапісцаў вельмі карысным матэрыялам з'яўляюцца калафонныя запісы (пасляслоўі) старажытных рукапісаў [11; 12; 13]. Кнігапісец, нават калі ён механічна перапісваў тэкст папярэдніка, пакідаў сляды сваёй індывідуальнасці ў помніку. Найбольш ярка індывідуальнасць праяўлялася менавіта ў тэксце калафонаў.

Узнікаюць пытанні. Наколькі дакладна можна вызначыць, якая частка тэксту калафона абумоўлена традыцыяй, а якая – праяўленнем індывідуальнасці кнігапісца; наколькі традыцыя адпавядала поглядам кнігапісца. Дзмітрый Ліхачоў пісаў аб літаратурным этыкеце старажытнарускай літаратуры [14, с. 95–122]. Згодна з ягоным меркаваннем, этыкет з паўсядзённага жыцця Старажытнай Русі перайшоў у мастацтва і літаратуру. Такім чынам, аўтар-кнігапісец быў вымушаны прытрымлівацца канонаў і падпарадкоўвацца традыцыі.

Гэтую думку можна перанесці і на калафоны. Безумоўна, калафонныя запісы – даніна традыці. Зразумела, што калафоны таксама «этыкетныя»; прэзентуючы сябе кнігапісец быў вельмі абмежаваным. Аднак аналіз калафонаў паказвае наяўнасць розных варыянтаў самапрэзентацыі. Акрамя звычайнага называння сябе і прафесіі гэта і шыфроўка свайго імя і, увогуле, ананімнасць. Калафоны маглі быць абшырнымі і сціслымі – гэта таксама, хутчэй за ўсё, праяўленне індывідуальнасці кнігапісцаў.

Наступнае пытанне. Што ляжыць у аснове самапрыніжэння, якое праяўляецца ў эпітэтах, якія выкарыстоўвалі кнігапісцы? Наколькі блізкі аўтарскі самапрыніжальны топас (г. зн. той, які выкарыстоўвалі *аўтары* кніг) тым эпітэтам, якія выкарыстоўвалі *перапісчыкі*? Сайман Франклін, напрыклад, лічыць, што самапрыніжальны топас аўтараў кніг – гэта толькі традыцыя і этыкет [15, с. 378–379]. Наколькі такое меркаванне слушна ў дачыненні да тэкстаў калафонаў?

Навошта кнігапісец указваў уласнае імя і, наадварот, навошта хаваў яго? Навошта кнігапісец, прытрымліваючыся этыкета, далучаў да свайго імя самапрыніжальныя эпітэты? Толькі каб не разыходзіцца з традыцыяй? Але ж ад калафона да калафона набор эпітэтаў розны.

Ідучы далей трэба ўзняць пытанне: чаму друкары, якія з'яўляюцца сапернікамі, але і нашчадкамі кнігапісцаў амаль не выкарыстоўвалі самапрыніжальны топас у сваіх калафонах?

Існуюць і іншыя пытанні. Напрыклад, ці можна прасачыць эвалюцыю самапрэзентацыі кнігапісцаў? Можна заўважыць, што абшырны аўтабіяграфічны калафон пачатку XVI ст., які пакінуў кнігапісец Мацвей Дзясяты вельмі адрозніваецца ад іншых. Незразумела толькі, ці гэта адзіны выпадак, ці вынік доўгай трансфармацыі традыцыі. Застаецца

незразумелым, наколькі правільным з'яўляецца меркаванне, што кнігапісец, ствараючы калафон, толькі ўстаўляў у трафарэт неабходныя словы.

Ірвінг Гофман ў сваёй кнізе «Прадстаўленне сябе іншым» спрабаваў паказць працэс самапрэзентацыі як тэатральную дзею. Калі прыняць ягоную тэрміналогію, самапрэзентацыя – гэта адносіны індывіда-«выканаўца» з патэнцыйным «гледачом» [16, с. 29–30]. Пры аналізе любой формы самапрэзентацыі неабходна ведаць, хто з'яўляецца асобай-«выканаўцам», а хто – «гледачом». Важна ведаць таксама мэты стварэння індывідам таго ці іншага вобраза сябе. Падрабязнага разгляду патрабуе матывацыя кнігапісцаў.

Згодна з прапанаванымі пытаннямі можна паставіць і задачы наступных даследаванняў:

- даказаць наяўнасць самапрэзентацыі, менавіта як часткі аўтарскай свядомасці;
- разгледзець элементы самапрэзентацыі;
- выявіць рэальнае значэнне літаратурнага этыкету для перапісчыкаў кніг;
- даследаваць эвалюцыю самапрэзентацыі;
- выявіць сувязь самапрэзентацыі аўтараў кніг і перапісчыкаў кніг;
- паказаць розніцу і падабенства прадстаўлення сябе аўтараў і перапісчыкаў.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Списывание книг в древние времена России // Православный собеседник, издаваемый при Казанской Духовной академии. Казань, 1862. Январь. С. 131–171.
2. *Некрасов И. С.* Древнерусский литератор // Беседы в Обществе любителей российской словесности при Императорском московском университете. М., 1867. Вып. 1. С. 39–50.
3. *Волков Н. В.* Действительно ли безыменна была большая часть трудов древнерусских переписчиков // Журнал Министерства народного просвещения. 1897. № 11. С. 70–82.
4. *Карский Е. Ф.* Славянская кирилловская палеография. М. : Наука, 1979.
5. *Рыбаков Б. А.* Ремесло древней Руси. М. : Изд-во АН СССР, 1948.
6. *Розов Н. Н.* Книга древней Руси XI–XIV вв. М. : Книга, 1977.
7. *Сапунов Б. В.* Книга в России в XI–XIII вв. Ленинград : Наука, 1978.
8. *Столярова Л. В.* Книга в Древней Руси (XI–XVI вв.). М. : Ун-т Дмитрия Пожарского, 2010.
9. *Konявская Е. Л.* Авторское самосознание древнерусского книжника (XI – середина XV в.). М. : Яз. рус. культуры, 2000.
10. *Левшун Л. В.* О слове преображенном и слове преображающем: теоретико-аналитический очерк истории восточнославянского книжного слова XI–XVIII веков. Минск : Белорус. Православная Церковь, 2009.

11. *Гальченко М. Г.* Записи писцов в датированных древнерусских рукописях XIII–XV вв. // Palaeoslavica. 2003. № XI. С. 68–141.
12. Рэлігійнае пісьменства кірылічнай традыцыі XI–XV стст. Мінск : Беларус. навука, 2013.
13. *Столярова Л. В.* Свод записей писцов, художников и переплетчиков древнерусских пергаменных кодексов XI–XIV веков. М. : Наука, 2000.
14. *Лихачев Д. С.* Поэтика древнерусской литературы. 2-е изд. Ленинград : Худож. лит. Ленингр. отд-ние, 1971.
15. *Франклин С.* Письменность, общество и культура в Древней Руси: (около 950 – 1300 гг.). СПб. : Дмитрий Буланин, 2010.
16. *Гофман И.* Представление себя другим в повседневной жизни = The presentation self in every day life. М. : Канон-пресс-Ц, Кучково поле, 2000.

# СУЧАСНЫЯ ІНАВАЦЫЙНЫЯ ФОРМЫ ПРАВЯДЗЕННЯ ЭКСКУРСІЙ У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ: АНІМАЦЫІ І КВЭСТЫ

**Я. С. Патапенка**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*patapienka20@gmail.com;*
*навук. кір. – І. У. Алюніна, канд. гіст. навук, дац.*

Артыкул прысвечаны інавацыйным формам правядзення экскурсій у Рэспубліцы Беларусь – анімацыі і квэсту. Аналізуюцца найбольш запатрабаваныя інавацыі ў экскурсійнай дзейнасці Беларусі, разнастайныя прапановы беларускіх туркампаній. Аб’ектам даследавання з’яўляецца рынак інавацыйных прапаноў беларускага экскурсійнага турбізнесу. Актуальнасць даследавання абумоўлена канкурэнцыяй на рынку турыстычных паслуг, што вымушае распрацоўваць новыя віды і формы турпрадукта, прымяняць інавацыйныя тэхналогіі ў яго папулярызацыі і распаўсюджванні. Навуковая навізназаключаецца ў комплексным падыходзе да вывучэння разнастайных інавацыйных прапаноў у экскурсійнай дзейнасці музеяў, турфірм, лясгасаў, заказнікаў, нацыянальных паркаў, аграсядзіб і крэатыўных экскурсаводаў.

***Ключавыя словы***: інавацыі; квэст; анімацыя; экскурсія; сучасны беларускі турбізнес.

Беларусь – краіна з унікальным прыродным і культурным патэнцыялам, раскрыць які трэба не толькі ўласным жыхарам, але і турыстам з суседніх дзяржаў. Людзі пакідаюць свае дамы і рушаць увандроўкі, на экскурсіі, у адпачынак. Яны хочуць атрымаць незабыўныя ўражанні, эмоцыі і перажыванні, якія ўскалыхнуць душу. У канкурэнтнай барацьбе за экскурсанта турысцкія прадпрыемствы, якія працуюць на ўнутраным рынку, пачынаюць распрацоўваць новыя турпрадукты, якія з цягам часу становяцца папулярнымі ў беларускага спажыўца.